* * *

16 снежня 2022 года ў залах Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь у Мінску адбылося адкрыццё юбілейнай выставы былога выкладчыка кафедры выяўленчага мастацтва мастацка-графічнага факультэта ВДУ імя П.М. Машэрава (1979–2014), вядомага прадстаўніка Віцебскай школы акварэлі Аляксандра Карпана. Дадзеная выстава (куратар М. Цыбульскі) стала першым праектам філіяла кафедры выяўленчага мастацтва, які быў арганізаваны ў Нацыянальным мастацкім музеі.

* * *

22 снежня выставачная зала мастацка-графічнага факультэта сустракала ўдзельнікаў і гасцей выставы "Героі свайго часу" заслужанага дзеяча мастацтваў Рэспублікі Беларусь, кавалера ордэна Францыска Скарыны, лаўрэата спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, ганаровага члена Расійскай акадэміі мастацтваў Мікалая Апіёка (куратар Міхась Цыбульскі). Цэнтральнае месца ў экспазіцыі занялі партрэты, якія былі напісаны мастаком у розныя часы.

Героямі партрэтаў М. Апіёка выступаюць знакавыя персанажы беларускай гісторыі і культуры, імёны якіх назаўжды ўпісаны ў летапіс зямлі беларускай. Адной з цэнтральных у творчасці мастака з'яўляецца серыя партрэтаў "Акцёры і ролі", дзе прадстаўлены вобразы беларускіх акцёраў у гістарычных постацях. З палотнаў на нас глядзяць героі мінулага: Усяслаў Чарадзей, Вітаўт, Ягайла, Еўфрасіння Полацкая, Францішак Скарына, Мікалай Гусоўскі, Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч.

Вобразы сваіх герояў Мікалай Апіёк знаходзіць не толькі ў мінулым, але і сярод сучаснікаў. Гэта людзі, якія праявілі сябе і сталі вядомымі ў навуцы, мастацтве, працы і спорце. У напісаных партрэтах мастак увекавечыў рэжысёра Міхаіла Пташука, выдатных акцёраў беларускай сцэны Стэфанію Станюту і Валерыя Раеўскага, музыкантаў Ігара Лучанка і Уладзіміра Мулявіна, мастакоў Мікалая Назаранку і Леаніда Шчамялёва, герояў спорту Аляксандра Мядзведзя і Дар'ю Домрачаву, касманаўта Алега Навіцкага і іншых. Асобная старонка ў партрэтным жанры – партрэты ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны.

Пасля адкрыцця выставы адбылася сустрэча М. Апіёка са студэнтамі мастацка-графічнага факультэта, дзе ў камерным фармаце мастак распавёў пра асноўныя свае творы, падзяліўся творчым і жыццёвым вопытам з маладым пакаленнем.

* * *

28–31 студзеня 2023 г. прайшло пасяджэнне журы Міжнароднага мастацкага праекта "На сваёй зямлі", які быў арганізаваны грамадскай арганізацыяй "Беларускі зялёны крыж". Конкурс праводзіўся па трох напрамках: жывапіс і графіка, мультыплікацыя, а таксама фатаграфія. Выкладчык кафедры выяўленчага мастацтва ВДУ імя П.М. Машэрава Ю.А. Багданава прыняла ўдзел у рабоце журы 18-га Міжнароднага конкурсу жывапісу і графікі. Члены журы разгледзелі больш за шэсць тысяч дзіцячых малюнкаў з 16 краін: Беларусі, Балгарыі, Венгрыі, Германіі, Індыі, Казахстана, Кітая, Кыргызстана, Літвы, Македоніі, Малдовы, Польшчы, Расіі, Сербіі, Славеніі, Турцыі. Міжнародны конкурс фатаграфіі адбыўся ў гэтым годзе ўпершыню. Вынікі работы журы будуць шырока агучаны ў красавіку 2023 года ў час арганізацыі чарговай выставы дадзенага праекта.

* * *

10 лютага ў Віцебскім мастацкім музеі адбылося адкрыццё мастацкай выстаўкі, прымеркаванай да 70-годдзя выпускніка мастацка-графічнага факультэта Віктара Аляксандравіча Мядзвецкага, а таксама прэзентацыя манаграфіі "Дарогай пошуку. Віцебская мастацкая школа" Аляксея Віктаравіча і Сяргея Віктаравіча Мядзвецкіх.

З творчасцю цудоўнай дынастыі членаў Беларускага саюза мастакоў Мядзвецкіх знаёмы не толькі ў Віцебску і Беларусі, але і за мяжой. Яе заснавальнік Віктар Аляксандравіч нарадзіўся 28 ліпеня 1952 г. у в. Адамаўка Лепельскага раёна.

У 1975 годзе ён скончыў мастацка-графічны факультэт ВДПІ імя С.М. Кірава. З 1987 года сябра Саюза мастакоў СССР, у цяперашні час Беларускага саюза мастакоў. Удзельнік шэрагу персанальных, рэспубліканскіх і міжнародных выставак. У сваёй творчасці мастак аддае перавагу працы ў графіцы і жывапісе.

У пачатку творчага шляху (1970–1980-я гг.) у карцінах В. Мядзвецкага дамінавалі рэалістычныя тэндэнцыі. Для гэтага перыяду характэрна перавага пейзажа і сюжэтна-тэматычнай карціны. Вернасць натуры заўсёды мела паслядоўны і прынцыповы характар. У цікавым вобразна-пластычным ключы вырашаныя кампазіцыі “Безыменныя вышыні” (1978), “Чэрвень 1941” (1978), “Смага. Партызаны” (1979), “Партрэт студэнткі” (1976), “Партрэт брыгадзіра В. Кавалеўскага” (1977) і інш.

Ужо ў 1990-я гг. у творах Віктара Мядзвецкага заўважаецца вызначаная аўтарская манера, у аснове якой праца з колерам і дэкаратыўна стылізаванымі натурнымі формамі. У гэты час адбываецца зварот мастака да стылістыкі мадэрнізму пачатку XX стагоддзя, захапленне творчасцю В. Кандзінскага, М. Ларыёнава, П. Філонава і інш.

Пры разглядзе сучасных кампазіцый мастака цалкам зразумела, што ён не губляе сувязі з рэальнасцю. Усё велізарнае багацце каляровых і пластычных асаблівасцей яго палотнаў заўсёды падпарадкавана вядучай мелодыі вобразнай задумы. У працах “Спас” (1988), “Гуканне вясны” (1999), “Да восені” (2002), “Раніца” (2005), “Пунсовы ветразь” (2010), “Зорка” (2012), “Рух” (2012) і шэрагу іншых пераважае каларыстычны пачатак. У карцінах Віктара Мядзвецкага вабіць паэтычная метафарычнасць, рытмічная арганізацыя кампазіцыі. Цікава вырашаны работы “Маладзік” (2004), “Святое возера” (2008), “Сон-трава” (2010), “Белая ноч” (2012).

У экспазіцыі дадзенай выставы таксама былі прадстаўлены работы двух сыноў Віктара – Сяргея і Аляксея Мядзвецкіх. Абодва яны скончылі мастацка-графічны факультэт ВДУ імя П.М. Машэрава, навучаліся ў аспірантуры Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (спецыяльнасць “Выяўленчае, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва і архітэктура, мастацтвазнаўства”). І Сяргей, і Аляксей з’яўляюцца ўдзельнікамі рэспубліканскіх і міжнародных выставак, маюць шэраг публікацый па праблемах развіцця сучаснага беларускага жывапісу.

Сяргей Мядзвецкі (10.05.1974), кандыдат мастацтвазнаўства (2004), дацэнт, выкладае на кафедры выяўленчага мастацтва з 2005 года. У сваёй творчасці ён аддае перавагу пейзажнаму жанру, пленэрнаму жывапісу. У камерных па характары краявідах пераважае лірычны настрой. Але пад знешне простым аблічам навакольнай прыроды ўтоены складаны філасофскі падтэкст. Прастата матыву толькі акцэнтуе ўвагу на жывапісным вобразе, на перадачы адчування ад пэўнага стану прыроды, на ўнутраных перажываннях аўтара.

Аляксей Мядзвецкі (20.06.1985) таксама дацэнт кафедры выяўленчага мастацтва (з 2015 г.), кандыдат мастацтвазнаўства (2012), дацэнт (2019). У сваіх жывапісных творах мастак звяртаецца да партрэта і пейзажа. Сярод яго кампазіцый прыцягваюць увагу паясны жаночы партрэт (2014) і пакаленны партрэт жонкі (2015), “Віцяблянка” (2016), партрэт мастака А. Падалінскага (2016).

На вернісажы адбылася прэзентацыя выдадзенай у нашым універсітэце манаграфіі “Дарогай пошуку. Віцебская мастацкая школа” Аляксея і Сяргея Мядзвецкіх. Дадзеная кніга прысвечана гісторыі станаўлення і развіцця Віцебскай мастацкай школы ў кантэксце сусветных мастацкіх працэсаў.

* * *

З сакавіка ў рамках 75-й Рэгіянальнай навукова-практычнай канферэнцыі выкладчыкаў, навуковых супрацоўнікаў і аспірантаў “Навука – адукацыі, вытворчасці, эканоміцы” прэзентаваўся новы мастацкі праект “Docendo Discimus 2023”. У экспазіцыі выставы, якая разгорнута ў зале мастацка-графічнага факультэта, прадстаўлены творчыя работы выкладчыкаў кафедры выяўленчага мастацтва. Сярод твораў жывапісныя і графічныя кампазіцыі, партрэты, пейзажы і нацюрморты.